**Незалежнае выданьне Жодзіна й Смалявіцкага раёну**

# Ïï РЭС àíàðàìà

**#3**(14)

**Сакавік, 2007**

Інфармацыйны агляд рэгіянальных і агульнанацыянальных падзеяў

Навіны, факты, камэнтары, карысныя парады:
эканоміка, грамадзтва, права, зьмены заканадаўства,
калектыўная абарона грамдзкіх інтарэсаў, правоў і свабодаў ...



## Ó ÍÓÌÀÐÛ:

*** ст. 2**

- **ПАРАД СІЛЫ ці слабога розуму ...?**



*** ст. 2-4**

- **“Вайна” у сталіцы Беларусі ...!?**



*** ст. 5,6,8**

- **Грамадзяне сьвяткуюць, а ўлада ваюе ...**



*** ст. 7**

- **КАМУНАлка ...**











Так сустракаў афіцыйны Менск сваіх грамадзянаў, якія зь верай і любоўю выйшлі на вуліцы сваёй сталіцы ў самы сымбалічны й сьвяточны для НЕЗАЛЕЖНАЙ Беларусі дзень - ДЗЕНЬ ВОЛІ. Любая краіна ганарылася б кожным, хто ўзьняў у паветра нацыянальны сьцяг СВАБОДЫ, насуперак шалёнаму супраціву й ваенізаванаму ўціску, сілавым акцыям, правакацыям і прывінтыўным затрыманьням - неадэкватнай рэакцыі існуючае ўлады.

Ïðýñ ÏÀÍÀÐÀÌÀ

Ініцыятыва “Мы - Ліцьвіны” & Licviny-INFA

Цэнтар Ліцьвіны ў Жодзіне



# ПАРАД СІЛЫ ці слабога розуму ў сьвяточным Менску (Беларусь)



На вуліцы сталіцы 25 сакавіка 2007г. выйшлі “баевікі Паўлючэнкі” - істэрыя страху альбо анамальна хваравітага ўспрыняцьця нацыянальнага сьвята, ёсьць прыкметаю скрайняе няўпэўненасьці ўлады, якая цудоўна ведае, чым могуць скончыцца ейныя экспэрымэнты над здаровым сэнсам.

Няма ў Сьвеце іншай краіны, якая б “рубіла дрэва” ўласнай незалежнасьці, працавала на ідэю супярэчную зь ёй, перасьледвала ўсіх, хто прагне свабоды і дабрабыту ўласнаму грамадзтву, якая падзяляла б народ на “сваіх” і “ворагаў”, ганьбіла і забараняла нацыянальныя сьвятыні, традыцыі, навязвала чужынскія норавы, палохала й зьневажала ўласных людзей, толькі за тое, што яны гатовыя бараніць ейны дзяржаўны сувэрэнітэт і нацыянальную годнасьць!

Улада, бачна, сама яшчэ не пазбавілася былых “піянэрскіх гальштукаў”, не дарасла да той ступені нацыянальнай і грамадзянскай сьвядомасьці, якая жыве ў народзе з часоў Вялікага Княства Літоўскага і наводзіць страх толькі на ворагаў і агрэсараў.





Фотавыявы з Дня Волі - 2007: Алесь Вольны і Аляксей Лапіцкі, Licviny-INFA, Жодзіна.



## Дзеяньні Уладаў на вуліцах Беларускай Сталіцы - палохалі грамадзянаў, дзяцей і жанчынаў, груба парушалі грамадзянскі спакой і парадак у дзень традыцыйнага сьвята і адпачынку - ДЗЕНЬ ВОЛІ.

Чым не нагода для адпаведных захадаў пракуратуры!?

Увесь гэты “антытэрарыстычны псыхоз”, скіраваны на ўласнае грамадзтва, прывінтыўна справакаваныя арышты, перашкоды ў свабодым перасоўваньні, суцэльная дэманстрацыя агрэсыўнасьці й сілы - усё, быццам, з кепска адрэжысаванага фільму.





# «Вайна» ў сталіцы Беларусі ...!?

Дзень Волі адсьвяткавалі без уладаў - ня гледзячы на цэлую кампанію, скіраваную на зрыў мерапрыемства. Урад у чарговы раз паказаў сваё бачаньне грамадзянскае згоды і міру. Ён зноў прадэманстраваў поўную неадэкватнасьць і скіраванасьць на канфрантацыю, на працяг злачыннага падзелу грамадства, і сёньня ўжо на тых, хто “ЗА ВОЛЬНУЮ БЕЛАРУСЬ!” і тых, хто “ЗА ПРАВІЛЬНУЮ ВОЛЬНУЮ БЕЛАРУСЬ” (!?).

Недарэмна, некаторыя міліцыянты(ткі), якіх выставілі проста “балванамі” перад іхнымі бацькамі, сябрамі й дзецьмі - выглядалі зьбянтэжана й няёмка. Але, шызоідны выгляд сілавікоў на вуліцах сонечнага Менску проста ўражваў. Скажоныя злобаю твары спэцназаўцаў разам з вар’яцкім выглядам іхных паганялаў у масках, спэцыялізуючыхся на ініцыацыі боек і бязьлітасных расправах з кожным, хто трапіць пад руку пасьля атрыманьня спэцыяльнага загаду - сапраўды мог напалохаць. Знаходзіцца побач з узброенымі вар’ятамі ці шчырымі “недабразычліўцамі” Вольнай Беларусі, што пад аховаю недатыкальнага статусу ўлады гатовыя ў любы час ўчыніць “разбой” з ужываньнем спэцсродкаў супраць мірнае дэманстрацы “ЗА ВОЛЬНУЮ БЕЛАРУСЬ”, сапраўды небясьпечна!? На сорам уладзе, “пудзілаў у касках” у сьвяточны дзень было зашмат. Іх не хавалі, як раней, па дварах і аўтобусах, а далі “пагуляць у вайнушку” адразу ў цэнтры сталіцы. Часам яны выклікалі да сябе сапраўднае спачуваньне. Пры гэтым, што можна было думаць пра інтэлект і ўзровень маральнасьці іхных “палкаводцаў”, што пасылалі іх “у народ” у такім выглядзе і настроі. Здавалася, калёна сапраўдных “небаракаў”, скіроўваемых апранутымі ў маскі “спэцамі”, рыхтавалася разьбіць “нябачнага ворага”. Але ворага - сапраўды не было. Таму, некаторых проста “клініла” ад гэткай зусім “няштатнай” сытуацыі. Абяцаных “баевікоў” на вуліцах сталіцы не аказалася, акрамя, канешне, самой паважанай “праваахоўы”. Было бачна, што шмат каму сорамна, няёмка ці не зразумела, навошта ім палохаць грамадзянаў і баевымі ботамі “таптаць асфальт” і вытаптываць “маладыя

*Працяг на стар. 4-5*



**“Афіцэр” Паўлючэнка кіраваў калёнаю “зомбі ў камуфляжы” - самыя неадэкватныя хавалі за маскамі скалечаныя злобаю твары і іздавалі зьвярыныя рыкі. За народныя грошы іх прывучылі ненавідзець Беларускі народ і бачыць перад сабою выключна ворагаў, зьнішчаць і быць бязьлітаснымі. Нашыя спачуваньні тым, хто трапіў да іх у кампанію ...**







## АЛЬБО дэманстрацыя мадэляў ад МВД “ВЯСНА 2007 У МЕНСКУ?







# Ï ÐÀÖßÃÂÀÅÖÖÀ?

# ÂÀÉ Í À ¡ ÁÅËÀÐÓÑ²



Licviny-INFA



*Працяг, пачатак на стар. 2*

газоны” на плошчы ПЕРАМОГІ - “ваяваць” супраць грамадзянаў, якія прыйшлі выказаць сваю любоў і адданасьць НЕЗАЛЕЖНАЕ БЕЛАРУСІ!? Ім у падтрымку, былі мабілізаваныя нават канцэлярскія кадры МУС ...

Правакацыйныя дзеяньні ўлады ў Дзень Волі - прывінтыўныя арышты й перасьлед актывістаў па ўсёй Беларусі, дэманстрацыя сілы ў цэнтры Менску, азлобленныя твары людзей у масках, іхныя зьвярыныя рыкі для падтрыманьня ўласнага баявога духу і агрэсыўнасьці ў сытуацыі, якая не патрабавала гвалту, кажа пра дэмаралізацыю і ідэйную дэградацыю самой улады. Яна сёньня баіцца прызнацца, што згубіла шмат часу і сродкаў у барацьбе з тым, што трэба было бараніць усім грамадзтвам, умацоўваючы Незалежнасьць і Свабоду Беларусі. Абіраючы сёньня незалежніцкую рыторыку і пафас, ці пераасэнсавала яна, нарэшце, свае памылкі? А можа вырашыла спыніць рэпрэсыі ў грамадзтве і адмовіцца ад азіяцкіх спосабаў кіраваньня ў Эўрапейскай дзяржаве? Асэнсавала неабходнасьць адраджаць нацыянальны дух і традыцыі дзеля міру й дабрабыту ў грамадзтве?

Падзеі ў Менску, нажаль, паказалі, што гэтага не адбылося. Зьмена курсу на сувэрэнітэт, абарону эканамічных інтарэсаў на гэтым фоне выглядаюць як новыя кан’юнктурныя ўстаноўкі ідэалягічнага зьместу, што мэтанакіравана ўводзяцца ў рыторыку і матэрыялы афіцыйных СМІ. Паказны плюралізм і “чэснасьць” улады разьбіваюцца ў пыл аб глыбу “аўтарытарна-дыктатарскай і славянафільскай сутнасьці” рэжыму. Ён, як і раней, лічыць актывістаў апазыцыі небясьпечнымі, аблівае яе брудам хлусьні, калі за ёй сёньня трэба праўдзіва прызнаць духоўны прыарытэт і ідэйную перамогу. У іншых абставінах, калі прыйшоў час сказаць праўду грамадзтву, неабходна было б актыўна далучаць прадстаўнікоў апошняй да кіраваньня краінай, пачынаць дыялёг за круглым столом і дасягаць нацыянальнае згоды. Гэта было б сапраўдным пачаткам новага мысьленьня і спыненьня курсу на падзел і разбурэньне грамадзтва. Незалежная Беларусь павінна быць Вольнай, Адзінай і Дэмакратычнай. Прыйшоў час адмовіцца ад дыктату і маніпуляцыяў сьвядомасьцю, двухсэнсоўнасьцю палітыкі і фармулёвак, спэкуляцыямі на тэму “адзінага народу” ў міжнародных дачыненьнях з дзяржавамі і мэтадычнага разбурэньня адзінства ўласнага народу. Годзе, панове, дурыць галовы. Прыйшоў час спыняць спэктакль, усім разам брацца за стваральную працу. Той, хто будзе гэтаму шкодзіць сьвядома, навязваць грамадзтву палітыку варожасьці да беларускае культурна-гістарычнае спадчыны, да нозьбітаў нацыянальных традыцыяў і дэмакратычнай мэнтальнасьці, хто будзе і надалей разбураць адзінства, падаўляць свабоду і злоўжываць уладаю, будзе асуджаны гісторыяй па ўласных заслугах.







**Дванаццаць патрабаваньняў Эўропы да ўладаў Беларусі - гэта шлях да законнасьці і дэмакратыі, міру і згоды, магчымасьць атрымаць сапраўдную дапамогу для стабільнага разьвіцьця краіны.**



**ЗАБАРАНІЦЬ “ДЗЕНЬ ВОЛІ” - НЕ МАГЧЫМА! СЬВЯТА НЕ АДМЯНІЛІ, НАВАТ, КАСКІ І ДУБІНКІ, ПАГРОЗЫ І НЕАДЭКВАТНЫ ВЫГЛЯД СПЭЦНАЗАЎЦАЎ.**

Photo: Licviny-INFA

# УРАД НЯ ВЕДАЎ, ЯК РАЗАМ З НАРОДАМ АДСЬВЯТКАВАЦЬ ДЗЕНЬ ВОЛІ. ЁН ПАКАЗАЎ СВАЁ “ПРАВІЛЬНАЕ” РАЗУМЕНЬНЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ І ЗГОДЫ Ў ГРАМАДЗТВЕ.

**Рэпартаж Алеся Вольнага**

25.03.2007 – ДЗЕНЬ ВОЛІ – вядомы ў сьвеце дзень ДЗЯРЖАЎНАЙ ГОДНАСЬЦІ І ГОНАРУ БЕЛАРУСАЎ, дзень, гістарычна зьвязаны з абвяшчэньнем у 1918 годзе Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) і пачатку новага этапу ў вызваленьні беларускага народу, у асэнсаваньні новых пэрспэктываў на шляху да аднаўленьня ім ДЗЯРЖАЎНАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БЕЛАРУСІ, да адраджэньня нацыянальнае культурнае прасторы ў агульнаэўрапейскім кантэксьце прыярытэтаў СВАБОДЫ, РОЎНАСЬЦІ і МІЖНАРОДНАГА ПРАВА. Апошняе, пабудаванае на падмурку ўзаемапавагі і неад’емнага права народаў на самавызначэньне, на захаваньне культурнае спадчыны і ўстойлівае разьвіцьцё дзеля міру, спакою, счасьця і дабрабыту.



Падобныя крокі робіць пры першай спрыяльнай магчымасьці кожны “забраны ў палон” народ. Ён няспынна нараджае і ўмацоўвае ўласны вызвольны патэнцыял, шукае самапавагі й гістарычнае праўды, марыць пра канчатковае пазбаўленьне ад цяжару падману і прыніжэньня, імкнецца да вызваленьня зь “кіпцюроў” прыгнёту й страху, ад любога роду “захопніцкага, імпэрскага панаваньня” на ягонай тэрыторыі. У той жа час, іншародная сіла пастаянна імкнецца абмяжоўваць волю народа, імкнецца пазбавіць яго памяці й навязаць свае каштоўнасьці, мэнталітэт і норавы. Для гэтага ёй неабходна мець уплыў на ўладу і такім чынам практычна ўсё кантраляваць. Культура тырана – заўсёды прыносіць з сабою дактрыну тыраніі. Для гэтага існуе цэласная сыстэма іншародных, супярэчных свабодзе каштоўнасьцяў – ідэалёгія панаваньня і сытага, “квітнеючага” рабства – сапраўднай “свабоды









*Працяг на стар. 6, 8*

Photo: Licviny-INFA

ÄÇÅÍÜÂÎË²

# ÃÎÐÀÄ ÃÅÐÎÉ - ÑÜÂßÒÊÓÅ!!!





**“Калі б ЛУКАвы быў бы рагатым і з хвастом, дык хто б яму тады паверыў?”**

Мы маем права жыць пад аховаю нашае ўлады – улады ПРАВА і ЗАКОНУ. Праўнае бязьмежжа скончыцца разам зь першым свабодным судовым працэсам і пакараньнем ПЕРШАГА ЧЫНОЎНІКА за перасьлед і ўціск, перавышэньне ўладных паўнамоцтваў, злачынную бязьдзейнасьць альбо валакіту. Злачынца – атрымае па законе.

Ад сумленьня праваахоўцаў залежыць лёс кожнага з грамадзянаў. Брыдка, калі нехта прадае ўласныя перакананьні і афіцэрскую годнасьць за права вярцецца ля ўладнага “карыта”. Людзі маюць права патрабаваць выкананьня чынавенствам адпаведных абавязкаў.

## À ¡ËÀÄÀ - ÂÀÞÅ ... Ç “ÁÀÅÂ²ÊÀÌ²”!?

*Працяг, пачатак на ст. 5*





Гэта былі злобныя вочы сапраўднага ЗОМБІ ці вар’ята! Дык каму давярае лёс грамадзянаў улада!?

хру-каньня ля “карыта” ўладара-сьвінапаса. Амаль заўсёды, на падкантрольнай тэрыторыі вядзецца інтэнсыўная “сэлекцыя” па вырошчваньні зь “мясцовых васалаў” новага тыпу пароды homo sapiens, праводзіцца грандыёзны сацыяльны экспэрымэнт па генэрацыі новага тыпу “чалавека” (вядомы тэрмін “савецкая нацыя”, “рускі мір”, “славянскі сабор” …).

Канцэнтрацыя ўладных паўнамоцтваў, поўны кантроль над сродкамі й манаполія на інфармацыю, разбурэньне прававой прасторы, падмурку грамадзянскіх правоў і свабодаў, падпарадкаваньне юстыцыі і праваахоўчых структураў, увядзеньне “пастулатаў” пануючай “адзіна правільнай ідэалёгіі”, перашкоды ў свабоднай камунікацыі паміж грамадзянамі, перасьлед любой грамадзянскай ініцыятывы (вайна супраць разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці), культывацыя страху й падману, пашырэньне эканамічнай залежнасьці ад сыстэмы … – даволі пазнавальныя для кожнага Беларуса прыкметы “гэткага экспэрымэнту” супраць натуральнага права кожнага чалавека і вольнага, а не аддадзенага ў рабства, народа.

Падобны аўтарытарна-камандны рэжым год за годам нясе шкоду грамадзтву, якое губляе час і сілы на пошук “ворагаў” і барацьбу зь імі толькі дзеля захаваньня “адзінаправільнага на погляд правадыра” спосабу праўленьня. Пры гэтым рэжым - падманвае і прыніжае, палохае і падзяляе, імкнецца татальна кантраляваць кожны крок і кожнае слова, любыя настроі і памкненьні да вольнасьці і свабоды, разбурае сыстэму законнага пераабраньня прадстаўнікоў уладаў іхным непасрэдным вышэйшым прызначэньнем і поўным ігнараваньнем Выбарчага права. Фактычна, рэжым імкнецца цалкам ліквідаваць для сябе любую рызыку неперавыбраньня - небясьпеку сваёй ліквідацыі і ўсталяваньня сучаснай сыстэмы кіраваньня праз законныя і свабодныя выбары, стрымлівае дэмакратычнае разьвіцьцё і ўдасканальваньне дзяржаўных інстытуцыяў у грамадзтве.

“Імпэрыі сілы” альбо “гвалтоўныя рэжымы”, якія трымаюцца на эксплюатацыі “страху вайны” ва ўзаемаадносінах з уласным народам, разбудаваўшыя рэпрэсыўныя апараты прымусу, скіраваныя супраць прагрэсыўнага дзеяньня, маюць апірышчам сілы “няспынны кантроль і цэнзуру, прымус і хлусьню, гвалт і страх”. Аднак, у хуткім часе яны, як сьледзтва, заканамерна спыняюць сваё існаваньне. І гэта - закон.

Народы, якія не разгубілі памяці, а гэта тое, што няздольна “праканраляваць любая тыранія альбо дыктатура”, - заўсёды здольныя адрадзіць уласны ПАТЭНЦЫЯЛ СВАБОДЫ і зьяўляюцца ад самога пачатку НЕПЕРАМОЖНЫМІ.

Кожнага з нас, асабліва актыўных грамадзянаў, “гвалтоўны рэжым” па “уласных правільных правілах” (мэтава напісаных для стварэньня імітацыі легітымнасьці ўласных дзеяньняў) у парушэньне Асноўнае дамовы грамадзтва з дзяржаваю (Канстытуцыі Беларусі) вельмі проста і безпакарана можа пазбавіць кожнага дзяржаўнае працы, сродкаў для існаваньня, сацыяльнай уладкаванасьці й спакою, здароўя і, нават, жыцьця ...

І, нягледзячы на тое, што ўсё гэта будзе рабіцца з намі толькі за тое, што мы на думку “галоўнага цэнзара” “няправільна” любім сябе, уласных дзяцей і сваіх блізкіх, уласную Радзіму (!?) …, ня так і не на той мове выказваем гэту любоў, “няправільна” думаем абменьваемся інфармацыяй, ведамі, пачуцьцямі і ўражаньнямі, “няправільна” і “несанкцыявана”, без “вышэйшага дазволу” зьбіраемся разам альбо імкнемся свабодна аб’ядноўвацца для рэалізацыі сваіх неад’емных правоў і свабодаў, “без дазволу” мацуем грамадзянскую згоду і салідарнасьць, імкнемся да

НАРОД, УЛАДА і ... КАМУНАЛКА

# ×ÀÐÍ ÎÁÛËÜÑÊ²ÄÎ Ì, ÊÀÌÓÍÀëêà...

Õîëàä ³ â³ëüãàöü,
Ïàêóòû É ñòðàòû,
õâàðîáû ...
Óëàäû àáÿöàþöü, àëå -
ïðàáëåìà öÿïëà äëÿ
×àðíîáûëüöà¢ íå
âûðàøàíà íàâàò äà
26.04.2007







## Ýêñïýðû ìýíò íåçàâåðøàíû?!

Як паведамлялася раней з-за палітыкі Жодзінскіх уладаў у дачыненьні да “Чарнобыльскага Дому”, дзе ад холаду і вільгаці перасяленцы з забруджанай пасьля катастрофы на ЧАЭС зоны пакутуюць ад невыносных умоваў пражываньня і шматгадовага невырашэньня праблемы холаду і вільгаці ў іхных кватэрах. Паказальна, што з тарца дома № 3 па Ф.Скарыны, дзе пражываюць прадстаўнікі мясцовае ўлады і старшыня Жодзінскага Савету Пугач А.С. праблема ўцяпленьня сьценавых панэляў вырашана адразу і без пытаньняў? Тут і сродкі адразу знайшліся і “валакіты” аніякай не было. У 4-тым, “народным” пад’езьдзе - людзі працягваюць пакутваць з-за цьвердалобасьці й нахабства, безадказнасьці чыноўнікаў, якія вырашылі на гэты раз атрымаць эканомію сродкаў на здароўі перасяленцаў.

З 2004 году - зроблена два заключэньня БНТУ, у 2006 годзе ўрэшце праведзена прадпісанае яшчэ ў 2004-2005 годзе БНТУ першачарговае заманалічваньне стыкоў, якое не прынесла належных вынікаў, што падцьвердзілі наступныя кантрольныя замеры Санстанцыі і адпаведныя кампэнсацыі заяўнікам, зробленыя па заяве жыхароў Камунальнымі службамі за парушэньне санітарна-гігіенічных стандартаў па ацяпленьні жыльля ўжо ў 2007 годзе. Аднак, кіраўніцтва АЖКГ, у чарговы раз, нават не паставіла на разгляд паседжаньня выканкаму пытаньне плянаваньня цеплавой рэабілітацыі пазначанай часткі “Чарнобыльскага Дома”!?

Аргумэнты аказаліся на дзіва простыя - не хапае сродкаў! Не падрыхтавана да паседжаньня новае заключэньне БНТУ! І, нават, - “у чарнобыльцаў усё нармальна, усё ў межах нормы”!? Пры гэтым, у дадзеным выпадку ўсё яскрава бачна, бо за пэрыяд з 2004г. ніхто з адказных асобаў, у тым ліку і дэпутат Пугач А.С., нават не спрабаваў адшукаць адразу “згубіўшыеся недзе” сродкі, а таксама не адказаў на пытаньне: “Навошта спатрэбілася чакаць чарговага заключэньня БНТУ за 2007г., калі два папярэдніх з прадпісаньнем уцяпленьня панэляў - былі пасьпяхова праігнараваныя?” А таксама, - “як можна казаць пра адсутнасьць праблемы і пры гэтым праводзіць пераразьлік плацяжоў на ацяпленьне па выніках зафіксаваных парушэньняў сацыяльнага нарматываў па ацяпленьні кватэраў? Пазыцыя кіраўніцтва “Жодзінскай Камуналкі” красамоўна паказвае ягоную безадказнасьць і разбэшчанасьць уладаю, яна мае дыскрымінацыйны характар да “шэраговых чарнобыльцаў”, грамадзянаў, якім акрамя як на законнасьць, няма на што спадзявацца. Але, гэта працуе і цалкам нармальна для дэмакратычных краінаў. А ў нас, ва ўмовах аўтарытарна-каманднай сыстэмы, народ доўга прывучалі да таго, што “закон - што дышла ...”. Акрамя таго, уалкам в ерагодна, што гэтая валакіта ёсьць таксама вынікам палітычнага перасьледу, распачатага па загадзе зь ідэалягічнага адзьдзелу выканкаму й скіраванага супраць пражываючых тут апазыцыянэтраў, Аляксея і Сьвятланы Лапіцкіх, якія прымусілі мясцовыя ўлады пайсьці на пераразьлік камунальных плацяжоў і здольныя адстойваць калектыўныя інтарэсы жодзінцаў у любых інстанцыях ... Аднак, так дробна і відавочна цынічна помсьціць “палітычным апанэнтам” - ня ўдзячная справа.

Абсалютна відавочна, што ва ўмовах дзейснага выбарнага мэханізму, пасьля дэманстрацыі падобнай безадказнасьці, асобных “штатных прадстаўнікоў народу” у гарадзкім Савеце, тым больш, у ягоным кіраўніцтве, больш ніхто б ніколі ня ўбачыў. А нам яшчэ спрабуюць даказаць, што грамадзкія і палітычныя правы грамадзянаў ёсьць другаснымі, негалоўнымі правамі! Каму гэта выгодна, здагадацца ня цяжка. Рэальнасьць паказвае адваротнае. Калі мы даб’емся сапраўдных свабодных выбараў, выкананьня нашых Канстытуцыйных правоў і свабодаў, свабоды слова і думкі, свабоды сходаў і асацыяцыяў, забароны дыскрымінацыі й перасьледу па палітычных матывах ..., рэальнага падзелу ўладаў і верхавенства скіраванага на прыарытэты кожнага чалавека закону - выкананьне нашых эканамічных інтарэсаў і законных патрабаваньняў будзе адбывацца нармальным чынам, як ва ўсіх разьвітых дэмакратыях “заможнай і квітнеючай” Эўропы.

**Licviny-INFA**
















Licviny-INFA, СВАБОДА

***Працяг, пачатак на стар. 5,6***

ідэалаў дэмакратыі і эўрапейскага адзінства, дзяржаўнае незалежнасьці і дабрабыту, да дабра і праўды, роўнасьці і годнасьці, міру й славы ўласнай Айчыны, усёй душою жадаем свабоды ўласнаму народу – гэтая ўлада, пакуль яна ўлада, будзе рабіць гэта з намі безпакарана. Бо няма каму судзіць “першакрыніцу правільнасьці” ў краіне. І пра гэта будуць бязконца і няспынна хлусіць па ўсіх “каналах” для падтрыманьня старанна ствараемага вобразу “ворагаў” (як нутраных гэтак і зьнешніх) і замацаваньня ў сьвядомасьці кожнага “піянэра” вобразу “вышэйшага правадыра й абаронцы”, які, як “вартавы пёс”, “дзённа й ночна” ахоўвае “мір і спакой” грамадства, змагаецца супраць “усяго сусьветнага зла, імпэрыялізму і бязконцых нутраных ягоных пасобнікаў” ...

І гэткая “адназначная, як іржавы цвік”, прадказальная, як “тупая піла”, і ненажэрная, як “дзіравая кішэня”, прабачце, “сыстэма” - дзеля звычайнага самазахаваньня заўсёды гатовая рызыкаваць і ахвяраваць кожным з нас па асобку, але ніколі не ўсімі разам.

Сыстэма без нас – “пусты гук”, набор “прыладаў”, месца якіх - на “гістарычным сьметніку”. І толькі нашая чалавечая, грамадзянская еднасьць, нашая салідарнасьць і ўзаемадапамога, асэнсаваньне безумоўнай легітымнасьці і неад’емнасьці грамадзянскіх правоў і свабодаў, “іхнае абавязковасьці” для “любога ўраду, любой сыстэмы і спосабу кіраваньня” ў нашай краіне - здольныя “зьмяніць” стан рэчаў, скіраваць вэктар разьвіцьця абратна ў кірунку цывілізаванага грамадзянскага прыарытэту.

Чаго ж баіцца “аўта-рытарны рэжым”? А у яго, як недасканалага мэханізму, безумоўна, таксама ёсьць свае страхі. І галоўны зь іх - страх, што яго перастануць баяцца. Ён баіцца праўды і інфармаванасьці, разьвіцьця грамадзтва, уразуменьня большасьцю галоўнага прынцыпу існаваньня дыктатуры – пашырэньня страху ў разрозьненым і прыніжаным грамадстве. Кім становіцца гэткі “монстр”, калі яго раптам перастаюць баяцца? Хутчэй ён пачынае нагадваць “пудзіла” ці “вар’ята”, хворага, якому забыліся аказаць тэрміновую мэдычную дапамогу, які ўжо нікога да сябе не падпускае і, пры гэтым, імкнецца ўсіх “навучыць, як правільна сябе паводзіць, каб жыць счасліва” у “заможнай і квітнеючай” краіне.

**Licviny-INFA**

Незалежнае выданьне грамадзкай супольнасьці Жодзіна
(Выдавецкая ініцыятыва “Мы - Ліцьвіны” і агенцыя Licviny-INFA)
Адрас рэдакцыі:
222160 Жодзіна, а/с 201
E-mail: c_licviny@tut.by
Наклад 299 асобнікаў.
Рэдактар **АЛЕСЬ ВОЛЬНЫ**
Пры перадруку спасылка на выданьне і першакрыніцу абавязковая.